


# ТЫМ, ХТО НЕРАЎНАДУШНЫ

**Віншуем з выхадам новай кнігі нашу калегу па СПБ, літаратуразнаўцу, літаратурнага крытыка, педагога Аліну САБУЦЬ. Навінка – навуковае выданне-пераможца IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч) у намінацыі «Крытыка і літаратуразнаўства» – называецца «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў» (Мінск, Выдавецкі цэнтр БДУ).**

У літаратуразнаўчым выданні на прыкладзе творчасці класікаў (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Максіма Гарэцкага) і сучаснікаў (Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Алега Лойкі, Галіны Тваранові, Генадзя Пашкова, Алеся Адамовіча, Яўгеніі Янішчыц, Вольгі Русілкі, Алеся Разанава і інш.), у тым ліку рэгіянальных пісьменнікаў (Аляксея Пяткевіча і Ігара Жука, Дануты Бічэль і Людмілы Кебіч, Людмілы Шаўчэнкі і Анатоля Апанасевіча, Ірыны Фамянковай і Віктара Кудлачова) даследуюцца нацыянальная самабытнасць айчыннай літаратуры, грамадска-культурны кантэкст, кантактныя сувязі беларускай літаратуры са славянскай і сусветнай літаратурай.

На факталагічным літаратурна-мастацкім і навукова-тэарэтычным матэрыяле разглядаюцца пытанні нашаніўскага дыскурсу, рэцэпцыі беларускай літаратуры ў свеце, мастацкага перакладу і міжкультурнай камунікацыі, дзіцячай літаратуры, паэзіі, прозы і літаратуразнаўства. Агляд літаратурнага працэсу XX-XXI стагоддзяў прадугледжвае ўменне спасцігаць аўтарскую пазіцыю і ацэньваць мастацкі твор з уласнага пункту гледжання.

Усе пяць раздзелаў кнігі («Класіка: суразмоўны дыялог праз стагоддзе», «Слова пра класіку і класіка слова: актуальнасць запаветаў», «Сучасны літаратурны свет», «Літаратурная Гродзеншчына сёння», «Беларуская літаратура ў сусветным кантэксце») — гэта пяць вымярэнняў аўтарскага бачання панарамнага літаратурнага працэсу. Акцэнтуецца ўвага на творчых партрэтах, творах і праблемах, у ацэнцы якіх крытыка і чытач перакрыжоўваюць часам дыяметральна процілеглыя меркаванні.

Адрасавана як прафесійным чытачам, так і шырокаму колу чытачоў-аматараў — тым, хто нераўнадушны да літаратурна-мастацкага пазнання жыцця, дапытліва шукае ў ім «красу і светласць».

Выданне кнігі «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX–XXI стагоддзяў» знакавае ўшанаваннем Года гістарычнай памяці. Гэта заканамерны працяг беларускай літаратурнай гісторыі, якую тварылі і твораць яе сведкі — класікі і сучаснікі.

***Анатацыя***

*Пра аўтара кнігі*